МАЙСТЭРСТВА

# МАЛАДЫЯ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ

**ДЗІЯНА АРЛОВА і ВАЛЕРЫЯ БЫЛІНСКАЯ, студэнткі 2 курса педагагічнага факультэта нашага ўніверсітэта завочнай формы навучання, прынялі ўдзел у V рэспубліканскім дыстанцыйным конкурсе «Творчасць маладых педагогаў» і атрымалі дыпломы 1 ступені.**

Конкурс, арганізаваны выдавецтвам «Пачатковая школа» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, складаўся з трох намінацый: «Дыдактычны сцэнарый урока», «Выхаваўчае мерапрыемства», «Працуем у беларускамоўнай школе». Удзельнік мог выбіраць любы кірунак і займацца распрацоўкай свайго праекта. У Валерыі і Дзіяны гэта выдатна атрымалася.

Дарэчы, дзяўчыны – выпускніцы Полацкага каледжа ВДУ імя П. М. Машэрава. Ужо другі год яны працуюць у школе і вучацца на педагагічным факультэце, бо лічаць, што настаўнікі павінны пастаянна развівацца і ўдасканальваць свае веды.

**Валерыя Былінская, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы №14 г. Наваполацка:**

«Я другі год запар удзельнічаю ў конкурсе «Творчасць маладых педагогаў» і ўжо двойчы перамагла ў намінацыі «Выхаваўчае мерапрыемства». Сёлета разам са сваімі вучнямі я распрацавала пазакласнае мерапрыемства «Дарожны лабірынт», якое ўключала ў сябе элементы навучання правілам дарожнага руху. Школьнікам прапаноўваліся станцыі, на кожнай з якіх трэба было выканаць пэўнае заданне. Дарэчы, на базе нашай школы ёсць спецыяльная пляцоўка, абсталяваная дарожнымі знакамі і пешаходнымі пераходамі».

**Дзіяна Арлова, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы №16 г. Наваполацка:**

«Я атрымала дыплом у намінацыі «Дыдактычны сцэнарый урока», займалася распрацоўкай урока матэматыкі. Я прапанавала дзецям правесці занятак ў форме падарожжа: на карце былі пазначаны месцы, якія мы павінны будзем наведаць. Напрыклад, спачатку мы патрапілі на востраў «Вуснага падліку».

Дзецям заўсёды цікава рашаць розныя задачы ў форме гульні. А ўрокі-падарожжа – гэта сучасна і нестандартна».



**На здымку:** (злева направа) Дзіяна Арлова, А.Ул. Даніч і Валерыя Былінская.

Ацэньвала работы ўдзельнікаў конкурсу «Творчасць маладых педагогаў» кампетэнтнае журы: настаўнікі-практыкі, прадстаўнікі вышэйшай школы і Нацыянальнага інстытута адукацыі. Сярод іх – загадчык кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі нашага ўніверсітэта кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Аксана Уладзіміраўна Даніч.**

«Ужо другі год запар я з'яўляюся членам журы гэтага конкурсу. І заўсёды прыемна, што сярод пераможцаў і прадстаўнікі ВДУ імя П. М. Машэрава.

Заўважу, што Валерыя і Дзіяна паступілі на наш факультэт дзякуючы прафарыентацыйнай рабоце, якую праводзяць у каледжы выкладчыкі ўніверсітэта. Дарэчы, у тых, хто прыходзіць да нас вучыцца, цудоўная базавая падрыхтоўка. Яны ўжо – таленавітыя педагогі, у іх працах можна ўбачыць інавацыйныя формы і міждысцыплінарныя сувязі. Гэтаму мы вучым і нашых студэнтаў, а яшчэ даём ім больш паглыбленыя веды і тлумачым новыя метадычныя напрамкі.

Усе нашыя выкладчыкі – гэта прафесіяналы, якія могуць падказаць, што сёння актуальна ў сферы педагогікі, як правільна трэба выкладаць мовы і матэматыку, на што звярнуць асаблівую ўвагу і якім чынам зацікавіць дзяцей», – адзначыла Аксана Уладзіміраўна.

Можна не сумнявацца, што падчас вучобы на педагагічным факультэце нашага ўніверсітэта маладыя настаўніцы Валерыя і Дзіяна атрымаюць грунтоўныя веды, якія абавязкова спатрэбяцца ім для далейшай працы ў школе.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота аўтара.**

# НАСТАЎНІК – ГЭТА ЗАЎСЁДЫ КРЭАТЫЎ

У рамках правядзення абласнога конкурсу «Настаўнік года» у Віцебскім абласным інстытутуце развіцця адукацыі прайшоў майстар-клас настаўнікаў, куды былі запрошаны студэнты філалагічнага факультэта.

На сустрэчы педагогі расказалі пра свой уласны вопыт, метады і прыёмы працы з класам, падзяліліся літаратурай, напрацоўкамі, схемамі, табліцамі.

Асабліва прысутным спадабалася выступленне настаўніцы ДУА «Коханаўская сярэдняя школа імя І.П. Кожара Талачынскага раёна» Жанны Леанідаўны Берасняковай. Яна расказала пра карысць прэзентацый на ўроку, якія эканомяць час настаўніка, а таксама дапамагаюць актывізаваць зрокавую памяць вучняў. Таксама Жанна Леанідаўна вядзе свой блог, дзе выкладвае распрацоўкі, дзеліцца вопытам. Як зазначыла педагог, настаўнік павінен быць крэатыўным і не адставаць ад часу, каб паспяваць за дзецьмі. Так, каб школьнікі лепш засвоілі інфармацыю, Ж.Л. Беараснякова прыдумвае розныя вершы і табліцы.

Таксама ўразіла выступленне настаўніцы ДУА «Гімназія № 2 г. Наваполацка» Вольгі Генадзьеўны Белазорчык. Яна праводзіла са студэнтамі ўрок беларускай літаратуры. Педагог падрыхтавала шмат заданняў, якія былі накіраваны на тое, каб зацікавіць вучняў літаратурай, дапамагчы ім чытаць вялікія тэксты хутка і з задавальненнем. Вольга Генадзьеўна прапанавала прыёмы апытання твора, якія дазваляюць праявіць дзецям фантазію на ўроку.

Вельмі цікавыя прыёмы тлумачэння правілаў беларускай мовы выкарыстоўвае Наталля Вітальеўна Осіпава, якая працуе ў ДУА «Яслі-сад – сярэдняя школа № 15 г. Полацка». Яна прапануе вучням рабіць асацыятыўныя малюнкі для лепшага засваення матэрыялу. Такім чынам, цяжкія правілы дзеці запамінаюць хутка і з ахвотай.

Гэтае мерапрыемства было вельмі цікавым і карысным для тых студэнтаў, якія пойдуць працаваць у школу, бо кожны з іх меў магчымасць пераняць вопыт і даведацца пра нешта новае.

**Анастасія МАРОЗАВА,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**